# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist

## Милан МАЙТАН (1934–2018)

## Мілан МАЙТАН (1934–2018)

## Milan MAJTAN (1934–2018)



30 чэрвеня 2018 г. на 85-м годзе жыцця перастала біцца сэрца доктара навук, вядучага славацкага лінгвіста, заснавальніка славацкай анамастычнай школы Мілана Майтана. Пайшоў з жыцця выдатны навуковец, шматгадовы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Людавіта Штура Славацкай акадэміі навук, настаўнік, светлы, душэўны чалавек, адданы навуцы і сваёй радзіме.

Нарадзіўся М. Майтан 3 мая 1934 г. у невялікім славацкім гарадку Врුткі. Пасля заканчэння ў 1957 г. Браціслаўскага педагагічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «славацкая мова» ён чатыры гады выкладаў у гімназіі ў Петржалцы – адным з раёнаў Браціславы. Аднак імкненне да навуковых даследаванняў прывяло М. Майтана ў Інстытут мовазнаўства імя Людавіта Штура (тады яшчэ Інстытут славацкай мовы), якому ён заставаўся верным да свайго выхаду на пенсію ў 2008 г. У 1984 г. М. Майтан стаў загадчыкам аддзела гісторыі славацкай мовы, а ў 1995–1999 гг. займаў пасаду намесніка дырэктара інстытута. Навыкі выкладчыка ён выкарыстоўваў пры чытанні студэнтам курсаў па гісторыі славацкай мовы і асноў славяназнаўства ва ўніверсітэтах Нітры, Прэшава і Трнавы, а таксама падчас кіраўніцтва даследчай работай аспірантаў.

Навуковая кар’ера М. Майтана пачалася ў аддзеле дыялекталогіі. Абараніўшы дысертацыю па тэме «Ганцянска-наваградскія гаворкі» (*Hontian-novohradské nárečia*, 1965), ён пазней засяродзіўся на новай лінгвістычнай дысцыпліне – анамастыцы, вынікам чаго пасля шматгадовых сістэматычных даследаванняў стала доктарская дысертацыя «Онімныя сістэмы. Даследаванні па славацкіх тапонімах» (*Onymické systémy. Štúdie o slovenskej toponymii*), абароненая ў 1995 г.

У актыўнай навуковай дзейнасці М. Майтана найбольш заўважнай працай стаў сямітомны «Гістарычны слоўнік славацкай мовы» (*Historický slovník slovenského jazyka*, 1991–2008 гг.). Аўтарскі калектыў атрымаў шмат дзяржаўных узнагарод як за асобныя тамы (1996, 2009), так і за працу ў цэлым (2010). Мілан Майтан быў кіраўніком аўтарскага калектыву, суаўтарам і навуковым рэдактарам слоўніка, удзельнічаў у распрацоўцы яго канцэпцыі. Цікавасць даследчыка да гісторыі славацкай мовы ўвасобілася ў яго рэдактарскай працы над зборнікамі аб паходжанні і развіцці славацкай мовы старажытнага перыяду (*O pôvode a o najstaršom vývine slovenčiny*, 1977), аб славацкай старажытнай лексіцы (*Z histórie lexiky staršej slovenčiny*, 2008), а таксама над серыяй крыніц па гісторыі славацкай мовы ў трох тамах (*Pramene k dejinám slovenčiny*, 1992, 2002, 2008).

Цэнтрам навуковай цікавасці і жыццёвых спраў М. Майтана стала славацкая анамастыка. Ён заклаў асновы і паспрыяў развіццю розных яе раздзелаў, аднак больш увагі надаваў тапаніміцы. Як сакратар, а потым доўгатэрміновы старшыня і член праўлення славацкай анамастычнай камісіі з моманту яе стварэння ў 1964 г., член праўлення анамастычнай камісіі ЧССР і член Міжнароднай камісіі па славянскай анамастыцы ў Міжнародным камітэце славістаў, ён планаваў даследаванне онімаў і быў адным з кіраўнікоў сістэматычнага вывучэння онімаў Славакіі. Навуковец актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы славянскага анамастычнага атласа і стаў суаўтарам працы аб структурных тыпах славянскіх мікратапонімаў на нямецкай мове (*Slawischer onomastischer Atlas. Die Strukturtypen der slawischen Ortsnamen*, 1988). Таксама ён выкарыстоўваў свае арганізацыйныя навыкі для правядзення рэгулярных (з 1967 г.) славацкіх анамастычных канферэнцый, якіх да гэтай пары адбылося 20.

З прац М. Майтана па анамастыцы найбольшай папулярнасцю карысталася кніга «Назвы населеных пунктаў Славакіі за апошнія дзвесце гадоў» (*Názvy obcí na Slovensku za ostatných dvesto rokov*, 1972), дзе аўтар апісаў пярэстую карціну развіцця назваў славацкіх населеных пунктаў, абумоўленую шматнацыянальнай сітуацыяй у Венгрыі, Славакіі і іншымі абставінамі. Абноўленая версія кнігі была апублікавана ў 1998 г. (*Názvy obcí Slovenskej republiky. Vývin v rokoch 1773–1997*). Славацкія назвы тлумачыліся М. Майтанам і ў слоўніку «Геаграфічныя назвы Чэхаславакіі» (*Zeměpisná jména Československa*, 1982), падрыхтаваным у суаўтарстве з чэшскімі калегамі.

Мілан Майтан актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы сумесных праектаў. Так, першым крокам да сістэматызацыі гідранімії Славакіі ў рамках праекта *Hydronymia Slovaciae* на аснове метадалагічных прынцыпаў міжнароднага навукова-даследчага праекта *Hydronymia Europeae* стала манаграфія М. Майтана і яго польскага калегі К. Рымута аб назвах водных аб'ектаў басейна Аравы (*Hydronimia dorzecze Orava*, 1985). Пазней, зноў жа з К. Рымутам, славацкі лінгвіст выдаў манаграфію аб гідронімах Дунайца на нямецкай мове (*Gewässernamen im Flussgebiet des Dunajec*, 1998), а з П. Жыгам – аб гідронімах Іпля (*Hydronymia povodia Ipľa*, 1999). Яшчэ большая заслуга М. Майтана заключаецца ў здольнасці матываваць маладое пакаленне славацкіх анамастаў на правядзенне даследаванняў гідраніміі: Люба Січакава (*Hydronymia slovenskej časti povodia Slanej*, 1996), Ярамір Кршко (*Hydronymia povodia Turca*, 2003), Юрай Гладкі (*Hydronymia povodia Nitry*, 2004), Драгамір Велічка (*Hydronymia povodia Kysuce*, 2011; сумесна з Ярамірам Кршко) працягнулі справу майстра і давялі працэнт апрацоўкі корпуса назваў славацкіх рэк амаль да 80 %.

Пад кіраўніцтвам М. Майтана ўдалося правесці збор мікратапонімаў з усёй тэрыторыі Славакіі. Было сабрана каля 250 тысяч найменняў, якія папярэдне апрацоўваліся для дзвюх традыцыйных картатэк (у алфавітным парадку і па раёнах і муніцыпалітэтах), і больш за 300 карт для Атласа славацкіх мясцовых назваў (*Atlas slovenských terénnych názvov*). Назіранні, зробленыя падчас выканання гэтага праекта, былі адлюстраваны ў манаграфіі «З лексікі славацкай тапаніміі» (*Z lexiky slovenskej toponymie*, 1996).

Шмат зрабіў М. Майтан і для правядзення стандартызацыі геаграфічных назваў Славакіі ў якасці члена тапанімічнай камісіі як у часы ЧССР, так і ў нацыянальны перыяд, а ў 1992–2001 гг. – як старшыня тапанімічнай камісіі славацкіх дзяржаўных органаў стандартызацыі. Ён удзельнічаў у падрыхтоўцы шматлікіх тамоў публікацый геаграфічных назваў ЧССР і Славацкай Рэспублікі на картах рознага маштабу, а таксама двойчы выдаваў тапанімічныя кіраўніцтвы для выдаўцоў картаграфічнай прадукцыі (1993, 1999).

У антрапаніміцы М. Майтан арыентаваўся на навуковае даследаванне працэсаў узнікнення і развіцця сістэмы асабістых імёнаў Славакіі і папулярызацыю вынікаў іх даследаванняў. У суаўтарстве з М. Паважаем апублікаваў дапаможнік аб хросных імёнах, які некалькі разоў перавыдаваўся пад назвамі «Імя для нашага дзіцяці» (*Meno pre naše dieťa*, 1983, 1985, 1993) і «Выберыце імя для свайго дзіцяці» (*Vyberte si meno pre svoje dieťa*, 1998). Гэтыя папулярныя выданні не толькі служаць для бацькоў, але і знаёмяць шырокае кола чытачоў з паходжаннем асабістых імёнаў, развіццём сістэмы наймення ў Славакіі і прозвішчамі, якія былі сфарміраваны з хросных імёнаў. Аб развіцці прозвішчаў ад мянушак да сённяшніх спадчынных прозвішчаў распавядае манаграфія М. Майтана «Нашы прозвішчы» (*Naše priezviská*, 2014).

Апісанню становішча спраў у славацкай анамастыцы і методыцы анамастычных даследаванняў прысвечаны працы для двухтомнай польскай энцыклапедыі «Славянская анамастыка» (*Słowiańska onomastyka*, тамы 1–2, 2002, 2003; сумесна з В. Бланарам) і дапаможнікі для студэнтаў «Методыка даследавання ўласных імёнаў» (*Metodika výskumu vlastných mien*, 1975; сумесна з М. Бліхам) і «Уводзіны ў анамастыку (*Úvod do onomastiky*, 1985; сумесна з М. Бліхам).

Таксама М. Майтан быў членам рэдакцыйных калегій чэшскага часопіса «Анамастычны бюлетэнь» (*Onomastický zpravodaj*, цяпер – *Acta onomastica*) і славацкага часопіса «Славацкая мова» (*Slovenská reč*).

Навуковая дзейнасць М. Майтана была высока ацэнена. Ён узнагароджаны сярэбраным (1984) і залатым (1999) ганаровымі ордэнамі Людавіта Штура за заслугі ў сацыяльных навуках, медалём Мацея Бела за заслугі ў гістарычных навуках (1984), прэміямі Славацкай акадэміі навук (1988, 1998, 2014), прэміяй Вруткі. Адна з самых высокіх дзяржаўных узнагарод – Прыбінаў крыж другой ступені за асаблівыя заслугі ў сферы культуры Славацкай Рэспублікі навуковец атрымаў у 2008 г.

Усе пералічаныя дасягненні Мілана Майтана кажуць самі за сябе. Ён дамогся поспехаў ва ўнутраным і міжнародным навуковым жыцці, пакінуў пасля сябе не толькі навуковыя працы, але і натхнёных яго прыкладам вучняў і калег з розных краін свету. У яго было разуменне для ўсіх, ён ніколі не адмаўляўся дапамагаць і заўсёды знаходзіў час для таго, хто быў гатовы слухаць яго каштоўныя парады. Пайшоў з жыцця важны вучоны, шаноўны калега, мудры настаўнік, дарагі сябар, шчодрая і таленавітая асоба.

***А. І. Копач***[1]


[1]***Олег Игоревич Копач***, кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры компьютерной лингвистики и лингводидактики факультета социокультурных коммуникаций Белорусского государственного университета.

***Алег Ігаравіч Копач***, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі факультэта сацыякультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

***Aleh I. Kopach***, PhD (philology), docent; associate professor at the department of computational linguistics and linguodidactics, faculty of sociocultural communications, Belarusian State University.

*alehkopach@gmail.com*